з гал. толькі па сэнсе («шмат працаваць», «размаўлялі па-сяброўску»). Сродкамі выражэння падпарадкавання служаць флексіі, службовыя словы (прыназоўнікі), словапарадак і інтанацыя (звычайна ў кантэксце). Стылістычна значымымі спосабамі афармлення граматычных сувязей з'яўляюцца *бязззлучнікавасць* і *шматзлучнікавасць*. *Т.Ф.Рослік.*

**ВІДЫ МАСТАЦТВА**, устойлівыя фармальна-змястоўныя ўтварэнні мастацкай культуры, што складаюцца з сукупнасці асобных маст. каштоўнасцей — твораў мастацтва. Адрозніваюцца паміж сабой выкарыстаннем матэрыялаў, у якіх увасабляюцца маст. вобразы. Гістарычна склаліся ў выніку натуральнага падзелу на часткі першапачаткова цэласнай (сінкрэтычнай) дзейнасці чалавека, альбо ў выніку далейшага сінтэзу гэтых частак на аснове новых тэхн. дасягненняў. Пералік В.м. і іх класіфікацыя з'яўляюцца пераменнымі велічынямі і залежаць ад таго, што разумеецца пад мастацтвам у кожны гістарычна канкрэтны перыяд часу. У антычнасці вызначальным з'яўлялася разуменне мастацтва як адмысловай дзейнасці, заснаванай на адпаведнай сістэме правіл, навыкаў, канонаў. Традыц. для сярэдневякоўя становіцца сістэма сямі вольных мастацтваў і сістэма сямі механічных мастацтваў. Першую складаюць «трывій» (граматыка, рыторыка, дыялектыка) і «квадрывій» (музыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія). Да другой адносяцца музыка, жывапіс, скульптура, архітэктура, тэатр. мастацтва, разнастайныя заняткі людзей (земляробства, паляванне, мараходства, ткацтва, збройвая справа, лячэнне). У перыяд італьян. Адраджэння мастацтвам пачынае лічыцца тое, што мае на мэце стварэнне цудоўнага і валодае пачуццёвай спецыфікай, таму да мастацтваў адносяць паэзію, л-ру, жывапіс, музыку, архітэктуру, скульптуру. Да сярэдзіны 18 ст. за гэтай катэгорыяй мастацтваў замацавалася назва «вытанчаныя мастацтвы». Прадстаўнікі Асветніцтва звязвалі яго з наяўнасцю разнастайных маст. сродкаў, якімі карысталіся музыканты, мастакі, пісьменнікі. У 2-й пал. 20 ст. адбылося поўнае размыванне межаў мастацтва як маст.-эстэтычнага феномена. Гэтаму часткова спрыяла развіццё В.м., заснаваных на дасягненнях навейшай тэхнікі: фатаграфіі, кіно, дызайну, тэлебачання, сеткавага мастацтва. У тэарэт. плане размыванне межаў мастацтва адбывалася дзякуючы структуралізму, постструктуралізму, постмадэрнізму, якія, увявіўшы універсум культуры ў якасці глабальнага тэксту, ураўноўваюць творы мастацтва з любымі выробленымі чалавекам прадметамі (артэфактамі). Сёння існуе некалькі класіфікацый В.м. Мастацтва падзяляюць на прасторавыя (архітэктура, скульптура, жывапіс і інш.); часавыя (літаратура, музыка і інш.) і прасторава-часавыя (тэатр). Прасторавыя мастацтвы прынята называць таксама статычнымі (прадметнымі), часавыя — дынамічнымі (працэсуальнымі), прасторава-часавыя — сінтэтычнымі. У сучаснай культуры існуе таксама дзяленне мастацтваў на выяўл. (жывапіс, скульптура) і выразныя (архітэктура, музыка). Існуе яшчэ адно дзяленне — на мастацтвы традыц. (архітэктура, жывапіс, скульптура, літаратура, музыка, тэатр) і тэхн. (фатаграфія, кіно, дызайн, радыё, тэлебачанне, сеткавае мастацтва). Кожная культура стварае свае В.м. і адбірае для сябе некаторыя з тых, якія стварылі іншыя культуры.

У Беларусі ў цяперашні час існуе развітая сістэма В.м. Да утылітарных эстэтычных каштоўнасцей адносяцца творы: дэкар.-прыкладнога мастацтва (па-мастацку афармленыя прадметы побыту), прам. мастацтва (аўтамабілі, самалёты і інш.), мастацтва інтэр'еру (маст. афармленне вытворчых і побытавых памяшканняў), садова-паркавае мастацтва, па-мастацку аформленай рэкламы, маст. афармлення, звязанага са спортам, святамі, дэманстрацыямі і інш. Маст. каштоўнасці, ці маст. творы, складаюць такія віды, як архітэктура, выяўл. мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура, фотамастацтва), музыка, танец, маст. л-ра, тэатр. мастацтва, кінамастацтва, радыёмастацтва, тэлевізійнае і сеткавае мастацтвы. Гіст. развіццё В.м. ідзе ад утылітарнага праз маст. да інтэлектуальнага ўзроўню эстэтычнай культуры.

*Літ.*: Бычков В.В. Эстетическая аура бытия. М., 1972; Крукоўскі М.І. Філасофія культуры. Мінск, 2000.

*В.В.Святлоў.*

**ВІДЭА...** (ад лац. video гляджу, бачу), частка складаных слоў, што ўказвае на адносіны да электрычных сігналаў, якія нясуць інфармацыю пра выяву (відэасігнал), а таксама да сістэм і прылад, што выкарыстоўваюцца ў сістэмах перадачы выявы (*відэафільм*).

**ВІДЭАКЛІП МУЗЫЧНЫ**, 1) экранная інтэрпрэтацыя эстраднай, поп- ці рок-песні. 2) Сінтэтычны жанр тэле- і відэамастацтва, у якім песня з'яўляецца структурна-жанравай асновай сінтэзу мастацтваў (літ., кампазітарская творчасць, муз. выканальніцтва, экраннае мастацтва). В.м. ўяўляе сабой складаны кінематаграфічны сінтэз вербальнага, муз. і візуальнага радоў, засн. на двайной інтэрпрэтацыі муз. твора — музыкантам-выканаўцай і групай стваральнікаў фільма. Песня садзейнічае раскрыццю муз. сродкамі маст. ідэі В.м. і выступае як аснова для стварэння гуказрокавай вобразнасці кліпа сродкамі выяўл.-выразнай мовы экрана (святло, колер, ракурс, план, камп'ютэрная графіка, спец. эфекты і інш.). Эстэтычны пошук гуказрокавай вобразнасці ў жанры В.м. засяроджаны на стварэнні экраннага іміджу выканаўцы; візуальнай інтэрпрэтацыі літ.-муз. зместу; стварэнні аўтаномнага візуальнага сюжэта для фарміравання дадатковых сэнсавых значэнняў. З'яўленне В.м. ў сучаснай маст. культуры азнаменавала сабой узнікненне новых спосабаў выкарыстання СМІ для прэзентацыі муз. твора і музыканта-выканаўцы ў рэкламных мэтах.

В.м. пачаў фарміравацца ў 1960-я гг. Распаўсюджанне звязана са з'яўленнем у 1980-х гг. кабельных муз. каналаў, рынку быт. відэаапаратуры і відэакасет, развіццю поп-музыкі і поп-індустрыі наогул. У Беларусі В.м. атрымаў распаўсюджанне ў сярэдзіне 1990-х гг.: у творчасці рэж. І.Пашкевіча — «Галубы» (1994, выканаўца І.Афанасьева, аператар С.Зубікаў), «Зялёныя вочы» (1995), «Каханая жанчына» (кампазітар абодвух А.Елісеенкаў, выканаўца А.Саладуха, апе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ратар П.Хацько), «Добры дзень, чужая мілая» (абодва 1996, выканаўца А.Саладуха, аператар П.Хацько), «Падарожнік» (1998, выканаўца Л.Краўцова, аператар С.Зубікаў); рэж. С.Агеенкі — «Воблака» (1998, выканаўца В.Алешка, аператар А.Абадоўскі); рэж. А.Грабёнкіна — «Музыка ночы» (1998, выканаўца І.Дарафеева, аператар А.Грабёнкін); рэж. А.Кудзіненкі — «Заўсёды ў дарозе» (1999, выканаўца В.Алешка, аператар Л.Кабернік); рэж. В.Шавялевіча — «Дрэнны хлопец», «Салама», «Венус» (выканаўца — група «Верасяты», аператар Л.Кабернік, усе 1999), «Восень» (2000, выканаўца В.Алешка, аператар Л.Кабернік); рэж. А.Трафіменкі — «Эклектык-шоу» (2000, выканаўцы Г.Абасава, І.Глушакоў, П.Данская, А.Шукайла, В.Ярмак, аператар А.Ермакоў); рэж. А.Бутара — «Вышыта сарочка» (2006), «Пульс маіх хвілін» (2008); рэж. А.Новікава — «Беларусь дужая» (2007, выканаўца ўсіх І.Дарафеева, аператар С.Новікаў); рэж. А.Адамчык — «Я хачу быць марай» (2007), «Любоў і радасць — Беларусь» (2008, выканаўца абодвух І.Дарафеева, аператар А.Адамчык); рэж. М.Васілеўскай — «Вар'ят» (2010, выканаўца М.Васілеўская, аператар А.Сцюф) і інш. З 1998 у Беларусі праводзіцца фестываль муз. кліпаў «Крыштальная манаграма» (Мінск).

*І.А.Смірнова.*

**ВАРАКО́МСКІ** Адам, пісьменнік 1-й пал. 18 ст. Магчыма, жыў, відаць, у Полацку. Аўтар паэмы на польск. мове «Гісторыя пра блаславёных мучанікаў» (1738, рукапіс зберагаецца ў архіве Санкт-Пецярбургскага філіяла Ін-та рас. гісторыі Рас. АН). У творы апісана знаходжанне летам 1705 у Полацку Пятра I, яго расправа над грэка-каталіцкім (уніяцкім) духавенствам. Аўтар асуджае цара за жорсткасць, аднак аддае належнае яго мудрасці, імкненню пашыраць у Рас. дзяржаве асвету. В. параўноўваў Пятра I з біблейскім царом Давідам. У мове паэмы выкарыстаны беларусізмы.

*А.В.Мальдзіс.*

**ВІДЭАМАСТА́ЦТВА**, від экраннага мастацтва, які сфарміраваўся на аснове кіна-, тэлемастацтва і дасягненняў сучаснай электронікі. Пераўтварэнне мовы кіно ў В. дасягаецца сродкамі камп'ютэрнага мантажу, які ўключае полівізійны мантаж, выкарыстанне адвольнай каларызацыі кадраў, шматкратныя экспазіцыі, адваротны рух плёнкі, электронную інкрустацыю, гукавыя і візуальныя спец. эфекты і інш. В. засн. на сінтэтычным узаемадзеянні выяўленча-выразных сродкаў прасторавых, прасторава-часавых і часавых відаў мастацтва, якія ўтвараюць у сваёй сукупнасці адзіную аўдыёвізуальную метамову В. У ёй сінтэзуюцца эстэтычныя ўласцівасці фатаграфіі, л-ры, музыкі, танца, тэатр. і выяўл. мастацтваў. Гал. сродкі выразнасці В.: фатаграфічная прырода выявы, якая з ілюзіяй рэальнасці аднаўляе на экране любыя карціны рэчаіснасці, і камп'ютэрны мантаж, што садзейнічае развіццю новых спосабаў рэжысёрскага мыслення пры стварэнні экраннага твора. Сінтэз выразных сродкаў розных відаў мастацтва ў рамках маст. структуры відэатвораў шматкратна павялічвае сілу іх уздзеяння, дазваляе комплексна раскрыць прадмет адлюстравання, стварыць экранны вобраз у арганічна-цэласным аўдыёвізуальным адзінстве, якое і нараджае спецыфічны для В. эфект мастацкасці. В. мае ўласцівасці «зрокавай літаратуры», «жывапісу, які рухаецца», «каляровай музыкі» і адначасова валодае экраннымі сродкамі выразнасці (рух камеры, святло, колер, ракурс, план, дробны мантаж, камп'ютэрная графіка, спец. эфекты і інш.). В. пачало фарміравацца ў 1960-я гг. ў сістэме тэлевізійнага кіно і першапачаткова выконвала выключна службовыя функцыі. З канца 1960-я гг. пачаўся выпуск дакум. *відэафільмаў* рэпрадукцыйных і крэатыўных форм розных жанравых мадыфікацый. Да сярэдзіны 1980-х гг. склалася сістэма аўтаномных самаст. відэастудый, з'явіліся відэафільмы, створаныя па законах мастацтва. За час развіцця В. сфарміравалася 4 яго асн. віды: ігравое відэакіно, у якім сродкамі выканальніцкай творчасці ўвасабляюцца рэальныя ці выдуманыя падзеі на падставе твораў кінадраматургіі альбо адаптаваных твораў прозы, драматургіі, паэзіі. Яму даступны магчымасці эпасу, лірыкі, драмы, раскрыццё складаных драм. канфліктаў; дакументальнае відэакіно, матэрыялам якога пераважна з'яўляецца відэазапіс рэальных асоб і сапр. падзей у іх маст. увасабленні, а хранікальна зафіксаваная на плёнку сучасная рэчаіснасць з цягам часу робіцца экраннай старонкай летапісу гісторыі. Яно валодае шырынёй магчымасцей публіцыст. жанраў л-ры і журналістыкі (нарыс, рэпартаж), кананічных жанраў жывапісу, музыкі (відэапартрэт, відэапейзаж, муз. *відэакліп*); анімацыйнае відэакіно, у якім сродкамі В. «адушаўляюцца» маляваныя, лялечныя ці выяўленыя ў камп'ютэрнай графіцы персанажы; навукова-папулярнае відэакіно, дзе выкарыстоўваюцца сродкі выразнасці 3 папярэдніх відаў В. для папулярызацыі навук. ведаў. Яно знаёміць гледачоў з жыццём прыроды і грамадства, адлюстроўвае ход творчых пошукаў дзеячаў культуры і мастацтва і інш., карыстаецца як дыдактычнымі, так і маст.-вобразнымі сродкамі ў залежнасці ад тэмы і задачы фільма. Творы В. (відэафільмы) распаўсюджваюцца пры дапамозе сродкаў аудыёвізуальнай камунікацыі (тэлебачанне, відэакасеты, відэадыскі) і ўвасабляюцца ў розных відах, жанрах і формах ажыццяўлення: рэпрадуктыўныя (запіс і распаўсюджванне лепшых узораў маст. сусв. культуры), прадуктыўныя (утварэнне ўласных маст. відэатвораў рознай жанравай мадыфікацыі). Стварэнне твораў В. — складаны творчы і вытворчы працэс, у якім аб'ядноўваецца праца дзеячаў мастацтва розных спецыяльнасцей: кінадраматурга (аўтара сцэнарыя); рэжысёра, які ўвасабляе маст. ідэю ў фільме і кіруе астатнімі творцамі відэафільма; аператара, які ўвасабляе выяўл. рашэнне твора сродкамі аптычнай, кампазіцыйнай, светатанальнай і каларыстычнай інтэрпрэтацыі выявы; акцёраў, якія рэалізуюць вобразы дзеючых асоб (у ігравым відэафільме); мастака, які знаходзіць выяўл. характарыстыку інтэр'ераў, экстэр'ераў, касцюмаў дзеючых асоб (у ігравым і анімацыйным відэафільмах); кампазітара, які сродкамі муз. экс-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ